**Верш**

***Кітай невядомы***

Кітай невядомы! Лугі і пустыні,
Зялёнае поле, шаўковы мурог,
У промнях камелій - заход вечаровы,
На вуліцах шумных - істужкі дарог.

Кітай незнаёмы! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў блакітныя высі нябёс,
Манчжурскім арэхам падаюць зоры,
Знікаюць у вяршынях тыбецкіх пастораў,
У травах, абсыпаных кроплямі рос.

Пяць тысяч стагоддзяў узрастаў і дужэў ты,
Паданні плывуць, як чаўны, пра цябе,
Па рысавым лузе, па Жоўтаму мору,
Па самай Вялікай Кітайскай сцяне.

Зямля Паднябеснай! Ты праз стагоддзі
Свой вопыт і мудрасць памножыць змагла,
Усё, што каштоўнае ты нараджала,
Да нашых нашчадкаў ты данясла.

І сіла твая, як бамбук, гнутка, моцна,
Высокая ростам, магутна ў плячах!
Шматлікі народ твой, вас многа, як сосен,
Як траў на бязмежных зялёных лугах.

Так хочацца мне разгадаць таямніцу,
Таемнае вабіць, цікавіць мяне,
І ўвачавідкі пабачыць сталіцу,
Пекінскае сонца і храмы твае.

Бліжэй пазнаёміцца з вашай прыродай,
З такім невядомым укладам жыцця,
З багатай культурай і неба свабодай,
Што да вяршыні цябе прывяла.

Што ведаю я пра Кітай? Вельмі многа!
Цудоўных краінаў на свеце так шмат.
Чаму тады кліча і вабіць дарога
У кітайскія далі, няпознаны рай?

І дзякуй вялікі табе за адкрыцці:

За порах, паперу і парасон,
За компас, фарфор, за чароўныя кнігі,
За мудрыя словы тваіх мудрацоў.

Яшчэ ў дні старыя, у век старадаўні
Аб гэтай краіне слава ішла,
Філосаф мудрэйшы, выдатны Канфуцый
Рассыпаў крыштальныя словы святла.

Нямала народаў з крыніц яго піла
І брала ад мудрасці вечны агонь,
У словах яго, знаходзячы сілу…
Ты слаўна, зямля, што вякам нарадзіла
Такога выдатнага сына свайго!
Вялікім адкрыццям – вечная слава,
Падзяка сусвета, Кітай, для цябе!
На сцэне планеты, ты – звышдзяржава,
Гавораць пра гэта без выдумкі ўсе.

І хоць Беларусь так далёка-далёка,
Нам трэба яднацца і сябраваць,
Адзінае неба, адзіная мэта,
Жыццё ў дабрабыце нам будаваць!